**УНЁСАК РОДУ ШАМЯКІНЫХ У ВЫВУЧЭННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ФАЛЬКЛОРУ**
***(да 95-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна)***

---

*Міхась Кенька*

## РОД ШАМЯКІНЫХ І ФАЛЬКЛОР

*У дадзеным артыкуле аналізуюцца адносіны да фальклору і ўнёсак у яго вывучэнне і папулярызацыю вядомага беларускага пісьменніка Івана Шамякіна, яго родных і сяброў. Тэкст падрыхтаваны паводле ўспамінаў калег Шамякіна і яго дачкі Таццяны Шамякінай – вядомага даследчыка-філолага, якае працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.*

*Mikhas Khenka*

## SHAMYAKINS FAMILY AND FOLKLORE

*This article analyzes the attitude towards folklore and contribution to the study and promotion of the famous Belarusian writer Ivan Shamyakin, his family and friends. Text prepared according to the recollections of Shamyakin's colleagues and his daughter Tatiana Shamyakina who is a famous explorer, philologist, works at the Belarusian State University.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старадаўняе выслоў'е пра тое, што прырода адпачывае на дзецях і ўнуках геніяў, у адносінах да роду Шамякіных не спрацоўвае. Яго дзеці і ўнукі таксама аказаліся далучанымі да творчасці ў літаратуры. Хай сабе раманістам ніхто з іх не стаў, але ў літаратуразнаўстве яны сябе сцвердзілі. Калі ж звярнуцца да вытокаў заяўленай у назве тэмы, то тут з'ява ці не адваротная. Іван Пятровіч Шамякін якраз і не выявіў літаратуразнаўчых досведаў у дачыненні да фальклору. Не напісаў ён і ніводнага артыкула, так ці інакш звязанага з народнай творчасцю. Ды гэтага ад яго і не патрабавалася – яго справай было ствараць мастацкую прозу. Але ж у аўтабіяграфіях многія пісьменнікі згадваюць, або пра гэта ўспамінаюць сучаснікі, што нейкім першаштуршком, поклічам да творчасці нешта ды паслужыла, у тым ліку і пачутыя ў дзяцінстве казкі, песні, паданні. А ад каго пачутыя?

У Шамякіна, як, мабыць, і ва ўсіх беларускіх пісьменнікаў, не было нянькі Арыны Радзівонаўны, якая б пазнаёміла яго з узорамі фальклорных твораў і тым самым абудзіла прагу да творчасці. Але ж, урэшце маці кожнага з іх, а гэта амаль заўжды маці-сялянка, у адрозненне ад далёкай ад народу дваранкі маці Пушкіна, гэта тая ж самая Арына Радзівонаўна. Не была выключэннем тут і маці Вані Шамякіна – Сынклецiя Сцяпанаўна, яна вельмі любіла спяваць, ну, і, зразумела расказвала сыну казкі. Добра спяваў вясковы стараста Сцяпан Калінін, а Трафім Мінавіч Шамякін, бацькаў брат, быў лепшы спявак у акрузе. Ну а далей уплывала многае – сялянскае акружэнне, вёска Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, а пазней – родная вёска жонкі Марыі Філатаўны, дзе Іван Пятровіч не раз бываў. Сястра жонкі – Вольга Філатаўна любіла расказваць мясцовыя паданні, легенды. А яшчэ былі песні, якія спяваліся на вяселлях, вечарынах, за працай і ў час адпачынку. Трапныя народныя выслоў'і, пачутыя ад землякоў. Паводле сведчання дачкі пісьменніка, Таццяны Іванаўны, бацька сам не любіў спяваць, але слухаў песні з задавальненнем, хадзіў на канцэрты. Дарэчы, адной з любімых у яго была народная песня «Распрагайце хлопцы коней» . Таццяна Іванаўна зазначае, што многія героі ў творах бацькі спяваюць**.**

Унучка Марыя Вячаславаўна ўспомніла, што для аповесці «Эпілог» Івану Пятровічу яна па яго просьбе падбірала зборнікі народных песень. Несумненна, што менавіта цікавасць да фальклору падахвоціла Івана Пятровіча набыць у Маскве манаграфію Барыса АляксандравічаРыбакова Язычество древних славян (1981 год выдання), і гэта кніга настолькі захапіла дачку – Таццяну Іванаўну – што яна не толькі зацікавілася міфалогіяй, але і пачала даследаваць яе сама. Адна за адной у друку сталі з'яўляцца публікацыі Таццяны Іванаўны па гэтай тэме, яна выступала з ёй на навуковых канферэнцыях, а потым выспела і доктарская дысертацыя «Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія», абароненая ў 2001 годзе.Адна за адной былі напісаны кнігі, «Беларуская класічная літаратура і міфалогія» (Мінск, 2001); «Міфалогія Беларусі» (Минск, 2000); «Эсхатология» (мифы о потопе) (Мінск, 2002); «Міфалогія і літаратура» (Мінск, 2003); «Славянская міфалогія. Курс лекцый» (Мінск, 2005); «Культура Кітая» (Мінск, 2006); «Культура Індыі» (Мінск, 2006); «Міфалогія і беларуская літаратура» (Мінск, 2008). У першай з іх – Міфалогія Беларусі паводле анатацыі ўпершыню беларуская міфалогія прадстаўлена як сістэма ў кантэксце сусветнай, у асноўным індаеўрапсйскай. Міфалогія паказана як выток літаратурных матываў і вобразаў, сюжэтаў выяўленчага мастацтва. Прасочваецца яе сувязь з

дэкаратыўным мастацтвам і архітэктурай. Шырока разглядаецца агульначалавечая праблематыка — Жыццё і Смерць, Чалавек і Прырода, Дабро і Зло. Міфалогія – неад’емны складнік фалькларыстыкі, міфы толькі і можна вывучаць праз фальклор. Апошняя з выдадзеных Таццянай Іванаўнай кніг «Парадоксы времени или романтика советской науки» – арыгінальнае эсэ, у якім апавядаецца пра папулярныя міфы аб патопе, Атлантыдзе, Граалі, Гіпербарэях.

І сёння Таццяна Іванаўна даследуе беларускую міфалогію ў кантэксце сусветнай, у сувязі з літаратурай і фальклорам, чытае аўтарскі курс лекцый «Славянская міфалогія», які ўяўляе сабою поўнае выкладанне дысцыпліны згодна адпаведнай праграмы.

А далей адбылося тое, што народнай творчасцю Таццяна Іванаўна зацікавіла і дачок. Яны пачалі займацца даследаваннем фальклору яшчэ ў студэнцкія гады, потым скончылі аспірантуру. Марыя Вячаславаўна абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Паэтыка беларускіх замоў», Славяна Вячаславаўна – кандыдацкую дысертацыю па тэме «Тыпалогія і структура аб’етных мастацкіх вобразаў на матэрыяле беларускіх чарадзейных казак», паводле якой выдала манаграфію «Рэчы ў казачным сусвеце» (Мінск, 2005). Цікава, што ў навуковыхканферэнцыях па фалькларыстыцы часам выступаюць адначасова маці і дочкі, а яшчэ другая дачка Шамякіна – Алеся, якая хаця і працуе тэкстолагам, але выступае і з навуковымі публікацыямі па фалькларыстыцы.

Якая ж мараль гэтай «байкі»? Што вынікае з усяго выкладзенага? Можа, перш за ўсё тое, што беларускі фальклор не знік, што ён жывіць мастацкую творчасць, збіраецца, вывучаецца, дае багата магчымасцяў для вучоных даследаваць яго асаблівасці. Гэта бачна і на прыкладзе трох пакаленняў адной сям’і.

*Вячаслаў Калацэй*

**ДРЭВА НА КАМНЯХ: ТРЫ ПАКАЛЕННІ БЕЛАРУСІСТАЎ З РОДУ ШАМЯКІНЫХ**

*У артыкуле асвятляюцца асноўныя напрамкі доўгачасовага плённага ўнёску ў беларусазнаўства і фалькларыстыку трох пакаленняў роду вядомага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча Івана Пятровіча Шамякіна.*

*Vyachaslav Kalatsei*

**THE TREE ON THE ROCKS: THREE GENERATIONS OF THE BELARUSIAN RESEARCHERS WHO BELONG TO THE SHAMYAKIN FAMILY**

*The article highlights the main directions of long-term fruitful contribution to Belarusica and folklore of three generations of the family of famous Belarusian writer and public figure Ivan Shamyakin.*

Прырода здольная ствараць цуд. Часам каменная скала запамінаецца ўсім асобным вялікім дрэвам, якое расце на яе камянях. Па логіцы рэчаў дрэва проста не павінна быць там: на вяршыні скалы – невялікая пляцоўка паверхні, і гэтага – недастаткова для сілкавання дрэва такога памеру. На скале «прычапіўся» адно толькі невялікі пласт зямлі, але дрэва квітнее. Як? Паглядзіце бліжэй, і вы ўбачыце адказ: такое дрэва мае мудрагелістую сістэму каранёў. Карані перакінутыя прама па паветры і шматлікімі адгалінаваннямі сілкуюць дрэва з глебы, што захавалася на крутых схілах скалы…




Малюнак 1 – Вокладка выдання «Этнаграфія Беларусі», рэдактарам якога быў Іван Шамякін, 1989







Малюнак 2 – Вокладкі выданняў Таццяны Шамякінай па міфалогіі і літаратуразнаўстве, 2001 – 2005



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ